МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
17 мая 2017 г.
№17 (401)



стар. 2

Самы складаны закон



стар. 7

Будні вясковага доктара



стар. 8

Ці лёгка стаць лепшым?

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА

# ЯК ЖЫВЕЦЦА ФАПу?

**Рост насельніцтва ў гарадах і змяншэнне яго ў сельскай мясцовасці працягваецца, аднак даступнасць меддапамогі застаецца аднолькавай**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Як вядома, у краіне дзейнічае тэрытарыяльны прынцып абслугоўвання — усе мы замацаваныя за ўрачамі пярвічнага звяна. Дарэчы, гэта 2193 участковыя педыятры, 952 урачы агульнай практыкі і 3889 участковых тэрапеўтаў. Паводле дзяржаўнага сацыяльнага стандарту, за ўрачом агульнай практыкі павінна быць замацавана 1300 чалавек, за ўчастковым тэрапеўтам — 1700, а за ўчастковым педыятрам — 800 дзяцей.**

стар. 3

КРУГЛЫ СТОЛ

# УМЕЦЬ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ

Якія захады патрэбны для павышэння ролі мясцовага самакіравання?




Фота Надзеі БУЖАН

**На жаль, далёка не ўсе выбаршчыкі ведаюць свайго дэпутата. Ужо гутарка не ідзе пра тое, ці цікавіцца насельніцтва, асабліва ў вялікіх гарадах, пытаннямі, якія вырашаюць мясцовыя ўлады... Як зрабіць прадстаўнікоў саветаў дэпутатаў больш пазнавальнымі, а іх працу больш эфектыўнай, — пра гэта ішла размова падчас круглага стала «Роля мясцовага самакіравання ў грамадскім і сацыяльна-эканамічным жыцці рэгіёнаў і краіны ў цэлым».**

У мерапрыемстве ўзялі ўдзел Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі, Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Леанід ЦУПРЫК, старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі, Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», Аляксандр ІВАНОЎСКІ, прафесар-кансультант Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Іван ЛІПНІЦКІ, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, Георгій АТАМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў па мандатнай, па галоснасці, самакіраванні, правапарадку і міжнародных сувязях, Віктар РАЖАНЕЦ, старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў, Наталля СУШКО, старшыня Жодзінскага гарадскога Савета дэпутатаў, Жанна ВАРАБЕЙ, старшыня Бараўлянскага сельскага Савета дэпутатаў, Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ, галоўны рэдактар газеты «Мінская праўда», Тамара ВЯЦКАЯ, дырэктар радыёстанцыі «Мінская хваля», Вадзім ШЧАГЛОЎ, галоўны рэдактар газеты «Бабруйскае жыццё».

стар. 4–5